Марцэвіч Я. В., студэнт 319 групы
дзённай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Войцік С. Ф.,
дацэнт кафедры

# ЖАНР БАЛАДЫ Ў ТРЫДЫЦЫЙНЫМ ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ ПАДНЯПРОЎЯ

Балада (ад франц. “ballade”, праванс. “balada” – танцавальная песня, ад позднелат. “ballo” – “танчу”) – першапачаткова ў раманскіх народаў аднагалосная танцавальная песня, якая вядзе паходжанне ад народных карагодных песень. Лія Мацвееўна Салавей, аўтар манаграфіі “Беларуская народная балада” (1978 г.), сцвярджае, што “балада – гэта апавядальная ліра-эпічная песня з напружнаным драматычным сюжэтам, якая адлюстроўвае трагічныя калізіі ў асабістым жыцці чалавека”.

Песні гэтага жанру – адна з крыніц багатага жыццёвага зместу, з дапамогай якой можна больш даведацца пра гісторыю, традыцыі роднага краю, стан душы народа, яго мудрасць, псіхалогію, светапогляд, яго эстэтычны і маральны ідэал. Беларускія балады не мелі адной акрэсленай назвы. Народныя спевакі называлі балады “доўгімі”, “зацягучымі”, “жалоснымі”, “смутнымі” песнямі.

Падзеям ў баладзе аддаецца асабістая ўвага. Балада не толькі апавядае пра пэўную падзею, але і робіць слухача яе сведкам. Мэтай балады з’яўляецца паказ пэўнага чалавека на адным з самых складаных, пераломных момантаў яго жыцця, якое часта завяршаецца трагічна. Для балады характэрна нязначная колькасць персанажаў, часцей за ўсё два ці тры. У сілу сціслацці балады героі паказаны не дэталёва, а эскізна:

найбольш яскрава выдзелены толькі некаторыя рысы характару, якія неабходны для вырашэння асноўнай ідэі песні і развіцця канфлікту.

Балада – жанр унікальны, спецыфічны і займае значнае месца ў песеннай культуры Падняпроўя. Яны праймаюць літаральна ўвесь песенны матэрыял сабраны ў кнізе “Песні беларускага Падняпроўя”, З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеевай, “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Магілёўскае Падняпроўе”.

У песенным фальклоры Падняпроўя сустракаюцца навелістычныя балады, якія адлюстроўваюць рэальныя жыццёвыя калізіі, канфлікты, нягоды, у якіх амаль не выкарыстоўваюцца элементы фантастыкі, і балады з міфалагічнымі матывамі, для якіх характэрна ўключэнне матыва метамарфозы. Для прапанаваных відаў балад, распаўсюджаных на Падняпроўі, характэрна наступная тэматыка: 1) тэма варожасці сям’і мужа ў дачыненні да маладой нявесткі; 2) аб свякрухе, якая ператварыла нявестку ў дрэва (бярозу, рабіну, каліну, таполю); 3) пра дачку птушку, якая прылятае ў родную хату (зязюля, ластаўка); 4) аб дзіцяці, якое нарадзілася па-за шлюбам і было забіта маці; 5) пра памерлую жонку і пакуты маладога мужа; 6) пра забітага на вайне мужа / брата / сына; 7) аб нявернай жонцы; 8) аб вольным жыцці да жаніцьбы або замужжа і г.д.

Балады належаць як жаночай, так і мужчынскай традыцыі спеваў. Толькі баладныя апавяданні пра лёс “замужніц” захоўваюць значэнне ўласна жаночых песень.

Па характары функцыяніравання ў традыцыйным народным побыце беларускія баладныя песни могуць быць падзелены на дзве асноўныя катэгорыі. Адну з іх складаюць тыя, якія ўключаны ў каляндарна-земляробчы песенны цыкл. Да іх адносяцца калядныя, веснавыя, траецкія, купальскія. У шэрагу выпадкаў эпічныя сюжэты

баладнага тыпу пранікаюць і ў жніўныя песні. Звычайна календарна-баладны мелас абапіраецца на стылістычны комплекс, які з'яўляецца агульным для ўсей раннетрадыцыйнай мелодыкі:

1) паўтарэнне мелодыі ў кожнай новай страфе дапускае варыянтныя адхіленні ад пачатковага контуру, але выключае кантраст;

2) ладавая структура вызначаецца аднапланавасцю;

3) дыяпазоны вагаюцца: а) амбітус (аб'ём мелодыі) у межах вялікай тэрцыі ці малой тэрцыі, чыстай кварты (з незапоўненай субквартай ці без яе); б) радзей у межах чыстай квінты (з малатэрцавым ці вялікатэрцавым запаўненнем).

Рытміка гэтых балад засноўваецца на меладычна-гібкім распяванні сілабічных вершаваных радкоў і пазбаўлена рэзкіх акцэнтаў. У прыклад можна прывесці: № 164 "А прыехаў брат сястру ў госці зваць" (калядная, F-dur, даяпазон – кварта), № 59 "Ішоў міленькі лужочкам" (веснавы карагод, амбітус – ч.4, апяванне тэрцыі), № 6 "Крапіўка мая" (спяваюць вясной, як полюць; квінта з запаўненнем), № 105 "Адна каля лесу йшла" (жніўная, квінта з запаўненнем).

Другую катэгорыю ўтвараюць балады, што ўваходзяць у цыкл бытавых песень, выконваемых у любы час ("абы-калі"). У меладычным плане гэтыя балады адрозніваюцца ад каляндарных большай вобразнай характарыстычнасцю. Напевы з'яўляюцца больш свабоднымі і гнуткімі, а таксама насычаны элементамі ўнутранай кантрастнасці. Кантраставанне ахоплівае ўсе кампаненты меладыйнай тканіны – ладаінтанацыйны, рытмічны, фактурны. У баладных песнях гэтай катэгорыі бачна тэндэнцыя рассоўвання дыяпазону напеваў, якія нярэдка перавышаюць актаўны. У прыклад можна прывесці песні: № 299 "Як ў маманькі доч бала адна" (cis-moll, дарыйскі лад, дыяпазон - актава),

№ 309 “Дзевіца крапівіцу жала” (A-dur, дынамічны і тэмпавы кантраст, песня для мужчынскага ансамбля).

Баладная песня пераважна аднагалосная, што вызначаецца спецыфікай жанру – індывідуальнае апавяданне, але сустракаюцца прыклады гетэрафоніі. Напрыклад: невялікія адхіленні ад унісону, утора, спевы з пералівамі і падцяг – найбольш распаўсюджанны на Магілёўшчыне від шматгалосся. Падвідамі падцяга з’яўляюцца гарманічна-кантрапунктычная манера спеваў, дзе верхні голас ідзе за ніжнім па прынцыпу нота супраць ноты з нязначный арнаментыкай (такі від шматгалосся на Палессі называецца прамой падводкай) і падгалосачна-паліфанічная манера спеваў, дзе для галасоў характэрны імправізацыйны пачатак, “закручаная” арнаментыка і разыход галасоў у актаву ў канцы песні (такі від шматгалосся на Палессі называецца падводкай з закруткамі). У прыклад можна прывесці наступныя музычныя нумары: № 300 “Аддаў мяне татанька далёка замуж” (невялікія адхіленні ад унісону), № 301 “Ой, даўно, даўно” (утора), № 104 “Пыжалей жа мне, мыя мамычка” (спевы з пералівамі), № 327 “Ой, да прахадзі жэ” (падгалосачна-паліфанічная манера спеваў), № 306 “Зашумеў жа лес, зашумела рошчухна”, № 316 “Як пайду я ў лес па дровы” (гарманічна-кантрапунктычная манера спеваў).

Даследуючы фоназапісы зробленыя ў перыяд з адзінаццатага па дзевятнаццаты год у в. Ціхцін Белыніцкага раёна, васемнаццаты год у Краснапольскім раёне студэнтцкім этнаграфічным таварыствам г. Магілёва, было выяўлена, што з дзвух дыскаў можна вылучыць больш за дзесяць балад. Абапіраючыся на гэта можна зрабіць выснову, што баладныя песні не страцілі сваёй актуальнасці і да гэтага часу праймаюць песенную культуру Падняпроўя. Стылістычныя рысы гэтых песень сведчаць пра іх пазнейшае паходжанне і іншую песенную

традыцыю. Яны ў меладычным, рытмічным стаўленні больш гнуткія, вольныя, нагадваюць лірычныя песні і часта злучаюць у сабе баладную апавядальнасць з карагоднасцю і нават танцавальнасцю. У гэтых баладах закранаюцца новыя тэмы, хоць мінулыя не страцілі сваёй актуальнасці. У прыклад можна прывесці наступныя песні: “Мне не ймецца” (у песні вядзецца аповед пра пакуты маладога мужа і малое дзіця, якія засталіся без жонкі/маці), “Ой, шумела, гудзела” (злучэнне песеннасці з танцавальнасцю).

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Балады: у 2 т. / рэдкал. К. П. Кабашнікаў, В. І. Ялатаў [і інш.]. Мінск, 1977. – Т. 1.
2. Салавей, Л. М. Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 192 с.
3. Мажэйка, З. Я., Варфаламеева, Т. Б. Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 392 с.
4. Мухарынская, Л. С. Беларуская народная музычная творчасць : вучэбны дапаможнік для музычных вышэйшых навучальных установ / Л. С. Мухарынская. – Мінск : Вышэйшая школа, 1993. – 343 с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / рэдкал. Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская Навука, 2001. – 797 с.